Л.А. Гедзімін

# ІВАН НАСОВІЧ – ЧАЛАВЕК-ЗАГАДКА



Мовазнавец-лексікограф, этнограф, фалькларыст, педагог, паэт, перакладчык, адміністратар, грамадскі дзеяч, чалавек вялікай эрудыцыі, паліглот, тэатрал, харыст, урэшце – проста гаспадар і бацька. Можна доўга пералічваць розныя іпастасі Івана Іванавіча Насовіча і да кожнай з іх упэўнена дадаваць эпітэты «выдатны», «выключны».

І.І. Насовіч нарадзіўся ў в. Гразівец Быхаўскага павета (цяпер Чавускі раён) у сям’і дзяка 26 верасня (7 кастрычніка) 1788 года. Мінула толькі 16 гадоў, як гэтыя тэрыторыі ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі, а грамадскае жыццё знаходзілася яшчэ пад дабратворным уплывам прагрэсіўных ідэй Асветніцтва.

Скончыўшы Магілёўскую гімназію і Магілёўскую духоўную семінарыю, быў настаўнікам, інспектарам Аршанскага духоўнага вучылішча (1812 – 1813), Мсціслаўскага духоўнага вучылішча (1813 – 1818), а пасля быў і рэктарам апошняга (1818 – 1822). З 1822 года працуе ў сістэме Міністэрства народнай асветы: загадчык, наглядчык, выкладчык Дынабургскай гімназіі (1822 – 1832, зараз г. Даўгаўпілс). Маладзечанскага (1832 – 1834), Свянцянскага дваранскіх вучылішчаў. Заслугі ў галіне адукацыі І.І. Насовіча, строгага, патрабавальнага, з абвостраным пачуццём справядлівасці педагога, былі адзначаныя ордэнам св. Станіслава III ступені.

У 1843 г. Насовіч выходзіць у адстаўку і пасля вяртання ў Мсціслаў займаецца навуковай дзейнасцю, супрацоўнічаючы з Археаграфічнай камісіяй, этнаграфічным аддзяленнем Рускага геаграфічнага таварыства, Аддзяленнем рускай мовы і славеснасці Акадэміі навук. У выніку гэтага супрацоўніцтва былі надрукаваны такія працы, як: «*Беларускія прыказкі і прымаўкі*» (1852), «*Зборнік беларускіх прыказак*» (1867), «*Беларускія прыказкі і загадкі*» (1868), «*Зборнік беларускіх прыказак*» (1874) і інш. За апошнюю працу, якая з’яўляецца першай такога роду ў беларускай фальклярыстыцы, Іван Іванавіч быў узнагароджаны залатым медалём Рускага геаграфічнага таварыства і абраны яго правадзейным членам. Выдатны знаўца беларускай народнай творчасці, І.Насовіч упершыню

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

ва ўсходнеславянскай фалькларыстыцы зрабіў спробу патлумачыць сэнс нашых прыказак і прымавак, адзначыць іх генезіс і асаблівасці функцыянавання, параўнаць іх з прыказкамі і прымаўкамі з іншых моў. «Звяртаючы ўважлівы погляд на беларускія народныя прыказкі», І.Насовіч сцвярджаў, «што яны складаюць для простага народа маральна-практычную філасофію», якую ён, безумоўна, цудоўна ведаў, што дае паставы назваць даследчыка энцыклапедыстам беларускага жыцця.

Няўрымслівы пенсіянер стварыў таксама унікальны гістарычны слоўнік «*Алфавітны паказальнік старых беларускіх слоў, выбраных з актаў, якія адносяцца да гісторыі Заходняй Расіі*» (1853), упершыню ўжыўшы структурны аналіз пры гістарычным вывучэнні лексікі. У слоўніку давалася тлумачэнне і лексікаграфічная інтэрпрэтацыя 12 тыс. рэестравых слоў (з іх 11 100 агульных слоў, звыш 600 слоў-варыянтаў, каля 100 уласных імёнаў і 200 геаграфічных назваў). За гэты своеасаблівы праваднік па старажытных дакументах, што істотна аблягчаў іх разуменне, аўтар заслужана атрымаў у 1865 г. Увараўскую прэмію. Рукапіс першага гістарычнага слоўніка беларускай мовы, над якім наш вядомы зямляк працаваў каля пяці гадоў, на жаль, да гэтай пары чакае свайго выхаду ў шырокі свет, як і многія іншыя працы слыннага даследчыка.

Асноўнае месца ў навуковай спадчыне Івана Іванавіча займае *«Слоўнік беларускай мовы»* (у арыгінале *«Словарь белорусского наречия»*), у якім падаецца больш за 30 тыс. слоў, запісаных аўтарам у Магілёўскай, Мінскай і Гродзенскай губернях, выбраных з беларускага фальклору, старабеларускіх пісьмовых помнікаў і філалагічных зборнікаў. Слоўнік гэты ствараўся больш за 20 гадоў і быў гатовы ў 1863 г., пасля рэцэнзавання І.Сразнеўскім адзначаны палавіннай Дзямідаўскай прэміяй у 1865 г., надрукаваны толькі ў 1870 г. (У 1881 г., ужо праз некалькі гадоў пасля смерці даследчыка, выдадзены дадатак да слоўніка на 1 тыс. слоў.) Гэта было першае грунтоўнае даследаванне ў галіне беларускай лексікаграфіі: слоўнік пераўзыходзіў падобныя беларускія слоўнікі як у колькасным, так і ў якасным плане. (Нягледзячы на тое, што ў яго свядома не ўключаны пласт агульнаўсходнеславянскай лексікі, ён большы за слоўнік Я.Чачота ў 150 разоў, П.Шпілеўскага – у 20 разоў, слоўнік заходнярускай гаворкі 1851 г. – у 7 разоў, С.Мікуцкага – у 15 разоў, Е.Раманава – у 30 разоў.)

Гэты слоўнік – унікальная з’ява: уся наступная беларуская лексікалогія грунтавалася менавіта на ім. Яшчэ І. Сразнеўскі адзначаў: «Толькі пры дапамозе такога слоўніка ... можна пачаць падрабязныя даследаванні складу беларускай мовы». Акрамя таго, слоўнік аказаў вялікі ўплыў на развіццё ўсёй усходнеславянскай лексікаграфіі, мае неацэннае значэнне для вырашэння многіх агульнаславістычных праблем.

Некалі французскі філосаф-асветнік Вальтэр сказаў: «Слоўнік – гэта Сусвет у алфавітным парадку». Іван Іванавіч Насовіч здолеў паказаць, што сусвет беларусаў бязмерны, а жыццё багатае і разнастайнае, даў магчымасць глыбей даследаваць гэты сусвет, што было немалаважна для развіцця нацыянальнай самасвядомасці. Вядома, што таўшчэзны слоўнік І.Насовіча быў

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

настольнай кнігай ў Максіма Багдановіча, па якой паэт вывучаў родную мову. «Слоўнік... » – гэта пераканаўчы аргумент на карысць існавання ў цэнтры Еўропы самабытнай і багатай беларускай мовы, а адпаведна і беларускага народа.

У 1870 г. за этнаграфічныя і мовазнаўчыя працы наш зямляк быў узнагароджаны ордэнам св. Станіслава II ступені. Але яго смерць 25 ліпеня 1877 г. засталася незаўважанай грамадскасцю: чалавека, што так многа зрабіў для роднага краю і на карысць дзяржавы, вернападданым якой быў, пахавалі ціха на могілках Тупічэўскага манастыра, і ніхто не знайшоў патрэбным паведаміць у сродках масавай інфармацыі пра сыход з жыцця «заслужанага працаўніка ... навукі» (І.Шэйн).



ПАВАЖАНЫ ТАВАРЫШ

*Аддзяленне грамадскіх навук АН БССР запрашае Вас прыняць удзел у навуковай канферэнцыі, прысвечанай 200-годдзю з дня нараджэння выдатнага беларускага філолага Івана Іванавіча Насовіча.*

*Канферэнцыя адбудзецца 25 кастрычніка 1988 г. у актавай зале Аддзялення грамадскіх навук АН БССР (г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, 2-і паверх) у 14 гадзін.*

Запрашэнне на навуковую канферэнцыю з нагоды 200-годдзя з дня нараджэння І.І. Насовіча, што адбылася ў АН БССР 25.10.1988 г. (унутраны разварот).

Нарадзіўшыся ў канцы XVIII ст., перажыўшы і наступленне французаў, і паўстанні, і змену цароў, ён, апантаны і працавіты, адукаваны і дапытлівы, нібыта пражыў некалькі жыццяў: і жыццё так званага грамадска карыснага чалавека (калі працаваў у сферы адукацыі), і жыццё навукоўца (калі выйшаў на пенсію і амаль увесь час даказваў, што яшчэ не стары і можа быць патрэбны навуцы). Якая сіла духу, прага жыцця і дзейнасці павінна быць у чалавека, які першыя даследчыцкія працы прадстаўляе на суд навуковай грамадскасці ў 62

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

гады, а «Слоўнік... » завяршае к 75! І пры гэтым, не так шмат знойдзецца людзей без спецыяльнай вышэйшай адукацыі і навуковых званняў, пра якіх можна было б сказаць так, як сказаў пра І.І. Насовіча рэцэнзент многіх работ даследчыка І.Сразнеўскі: «Неабходна было б выдаць сабранае ім *усё без выключэння*, таму што ўсё аднолькава заслугоўвае поўнага даверу і *ўсё цікавае і патрэбнае для пазнання беларускага народа*».

Асоба і творчая спадчына І.І. Насовіча па-ранейшаму з'яўляюцца прыцягальным цэнтрам увагі навукоўцаў, яскравым прыкладам чаго і служыць гэты зборнік, падрыхтаваны ў гонар 220-годдзя з дня нараджэння «беларускага Даля». Сведчаннем актуальнасці прац нашага славутага земляка выступаюць шматлікія публікацыі пра яго ў розных выданнях на працягу XIX – пачатку XXI ст.

### І. Выданні І.І. Насовіча (у храналагічным парадку)

1. Носович, И.И. Об ответном послании российских архиереев к сорбонским епископам / И.И. Носович // Могил. губ. вед. – 1848. – № 17, 18, 20, 21, 23–27.
2. Носович, И.И. Белорусские пословицы и поговорки / И.И. Носович // Известия Имп. АН по ОРЯС. – 1852. – Т. 1.– С. 34–79.
3. Носович, И.И. Объяснения к белорусским пословицам и поговоркам / И.И. Носович // Известия Имп. АН по ОРЯС. – Т. 1. – 1852. – С. 103–107.
4. Носович, И.И. Переложение начальных 23 псалмов пророка Давида в русские стихи. Надворный советник и кавалер Иван Носович / И.И. Носович. – СПб., 1865. – 40 с.
5. Носович, И.И. Псаломские песни, переложенные в стихотворную русскую речь н. с. и кавалером Иваном Носовичем / И.И. Носович. – СПб., 1866. – 40 с.
6. Носович, И.И. О борьбе истинного благочестия с суеверием и заблуждениями во времена ветхозаветной церкви, или исторический очерк внутренней жизни иудеев, извлеченный из книг священного писания названым советников и кавалером Иваном Носовичем / И.И. Носович. – СПб.: Тип. В.Безобразова и К, 1867. – 104 с.
7. Носович, И.И. Сборник белорусских пословиц, составленный надворным советником И.И. Носовичем и удостоенный от императорского Русского географического общества Малой золотой медали / И.И. Носович // Записки имп. Рус. геогр. об-ва по Отд-нию этногр. – 1867. – Т. 1. – СПб.: Рус. геогр. об-во, 1866. – С. 251–482.
8. Носович, И.И. Белорусские пословицы и загадки (доп. к сборнику белорусских пословиц, помещенному в Т. 1 «Записок Российского географического общества по Отделению этнографии») / И.И. Носович // Зап. Имп. Рус. геогр. об-ва по Отд-нию этногр. – 1868. [На вокл.: 1869] – Т. 2. Тое ж асобным выданнем. – СПб.: Тип. Майкова, 1868. – 19 с.

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

9. Носович, И.И. Ответное послание российских архипастырей к богословам Сорбонской Парижской академии по вопросу о соединении российской православной церкви с римской католическою / И.И. Носович. – СПб.: Тип. Духовного журнала «Странник», 1869. – 14 с.
10. Носович, И.И. Псаломские песни, или Сто пятьдесят псалмов псалтыри Давида, пророка и царя, переложенных в русскую стихотворную речь н. с. и кавалером И.Носовичем / И.И. Носович. – СПб., 1869. – VIII, 265 с.
11. Носович, И.И. Словарь белорусского наречия / И.И. Носович – СПб.: ОРЯС Имп. АН, 1870. – 756 с. Тое ж: Насовіч, І.І. Слоўнік беларускай мовы / І.І. Насовіч; аўт. уступ. арт. М.Р. Суднік. – Мінск: БелСЭ, 1983. – 756 с.
12. Носович, И.И. Белорусские песни, собранные И.И. Носовичем / И.И. Носович // Зап. Имп. Рус. геогр. о-ва по Отд-нию этногр. – 1873. – Т. 5. – С. 45–280. Тое ж асобным выданнем. – СПб.: Тип. Майкова, 1874. – 236 с
13. Носович, И.И. Сборник белорусских пословиц / И.И. Носович // Сб. ОРЯС Имп. АН. – Т. 12. – № 2. – СПб.: Тип. Имп. АН, 1874. – VI, 232 с.
14. Носович, И.И. О значении Всепьянейшего собора, учрежденного Петром Великим / И.И. Носович // Записки Имп. АН. – 1875. – Т. 25. Тое ж асобным выданнем. – СПб.: Тип. Имп. АН, 1875. – 6 с.
15. Носович, И.И. Дополнение к белорусскому словарю. Слова, извлеченные из составленной им рукописи собрания белорусских песен и сказок / И.И. Носович // Сб. ОРЯС. – Т. 21. – № 6. – С. 1–22. – СПб., 1881. – 22 с.
16. Носович, И.И. Воспоминания моей жизни: [Записки языковеда и фольклориста] / И.Носович; вступ. сл. Н.Гилевича; подгот. к печати Т.М. Судник, Ю.М. Судник, А.Ю. Казакова // Неман. – 1997. – № 2. – С. 175–243; № 3. – С. 179–239; № 4. – С. 194–254. (Частковая публікацыя аднайменнага рукапісу.)

## II. Рукапісныя і згубленыя працы І.І. Насовіча

1. Носович, И.И. «Vetera monumento Poloniae et Lithuaniae» («Старажытныя помнікі, якія асвятляюць гісторыю Польшчы і Літвы») Тэйнера ў 3-х т. в переводе на русский язык.
2. Носович, И.И. Алфавитный указатель старинных слов, извлеченных из «Актов, относящихся к истори Западной России», изданных в 1853 г. (1110 стар., каля 12 тыс. слоў; захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Бібліятэкі Расійскай акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу.)
3. Носович, И.И. Воспоминания моей жизни. (Захоўваецца ў Інстытуце мовы і літаратуры імя Я.Коласа і Я.Купалы НАН Беларусі.)
4. Носович, И.И. Извлечение из алфавитного указателя старинных слов, которые по словопроизведению должны были существовать, хотя в «Актах Западной России» их не имеется. (Больш за 14 стар, 1086 слоў; захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Бібліятэкі Расійскай акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу.)

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

5. Носович, И.И. О племенах до времен Рюрика, населявших белорусскую территорию. (Захоўваецца ў Інстытуце мовы і літаратуры імя Я.Коласа і Я.Купалы НАН Беларусі.)
6. Носович, И.И. Опыт краткого филологического наблюдения о белорусском наречии. (Захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Бібліятэкі Расійскай акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу.)
7. Носович, И.И. Сборник белорусских народных баек, повестей и былей. (Дасланы ў 1852 г. у Акадэмію навук І.І. Сразнеўскаму, згублены.)
8. Носович, И.И. Сборник белорусских народных песен. (Дасланы ў 1852 г. у Акадэмію навук І.І. Сразнеўскаму, згублены.)
9. Носович, И.И. Собрание белорусских слов по алфавиту. (Захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Бібліятэкі Расійскай акадэміі навук у Санкт-Пецярбургу.)
10. Носович, И.И. Сочинения, в том числе поэма «Иудиата». (Папка з рукапіснымі творамі захоўваецца ў аддзеле рэдкай кнігі і рукапісаў Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі імя М.Я. Салтыкова-Шчадрына, ф. 120, аддз. зах. 1012, а. 38.)

## III. Даследаванні пра І.І. Насовіча

1. Абабурка, М. Багатая душа народа...: [Да 100-годдзя з дня смерці беларускага лексіколага, этнографа і фалькларыста І.І. Насовіча] / М.Абабурка // Магілёўская праўда. – 1977. – 23 ліп.
2. Абабурка, М. Беларускі Даль: [Да 200-годдзя з дня нараджэння І.Насовіча] / М.Абабурка // Магілёўская праўда. – 1988. – 30 верасня.
3. Андрээва, Е.Г. У іпастасях педагога, мовазнаўцы-лексікографа, фалькларыста і этнографа / Е.Г. Андрээва, Л.М. Лыч // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 4. – С. 71–74.
4. Антропаў, М.П. Славуты фалькларыст і лексікограф: [Да 200-годдзя з дня нараджэння І.І. Насовіча] / М.П. Антропаў, В.Д. Ліцвінка // Веснік Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Серыя 4. – 1988. – № 3. – С. 6–9.
5. Бандарчык, В.К. Гісторыя беларускай этнаграфіі XIX ст. / В.К. Бандарчык; Інст. маст-знаўства, этнагр. і фалькл. Мін. культ. БССР. – Мінск: Навука і тэхніка, 1964. – С. 20, 21, 63, 83, 84, 109–116, 172, 174, 208, 242, 244.
6. Бандарчык, В.К. З клопатам аб роднай мове: [Да 200-годдзя з дня нараджэння І.Насовіча] / В.К. Бандарчык // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1988. – № 10. – С. 72–74.
7. Бандарчык, В.К. Насовіч Іван Іванавіч [1788 – 1877] / В.К. Бандарчык // Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя / БелСЭ; рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – С. 363–364.
8. Бандарчык, В. Этнограф, фалькларыст, мовазнаўца: [Да 175-годдзя з дня нараджэння І.І. Насовіча] / В.Бандарчык, Э.Сабаленка // ЛіМ. – 1963. – 30 жніўня.
9. Бегуновіч, А. Гонар зямлі Мсціслаўскай / А.Бегуновіч // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). – 1988.– 4 кастр.

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

10. Беларускі Даль / падрыхтаваў П.М.Сырадоеў // Памяць: Чавускі р-н: Гіст.-дак. хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэдкал.: А.Н. Вінкевіч [і інш.]. – Мінск: Ураджай, 2001. – С. 71.
11. Беларускі слоўнік Насовіча і Расійская акадэмія навук // Веда. – 1952. – С. 53.
12. Бессонов, П. Белорусские песни с подробными объяснениями их творчества и языка, с очерками народного обряда, обычая и всего быта / П.Бессонов – М.: Тип. Бахметева, 1871. – Ч. 1. – Вып. 1. – С. VI–VII.
13. Борковский, В.И. Изучение белорусского языка в дореволюционное и советское время / В.И. Борковский // Белодед, И.К., Борковский, В.И., Горецкий, П.И. Изучение украинского и белорусского языков / И.К. Белодед, В.И. Борковский, П.И. Горецкий; отв. ред. Ф.Ф. Кузьмин. – (Серия «История отечественного языкознания». / Ин-т языкознания АН СССР. – Вып. 1). – М., 1958. – С. 113–114.
14. Булахаў, М.Г. Лексікаграфія / М.Г. Булахаў // Курс сучаснай беларускай літаратурнай мовы: Фанетыка. Арфаграфія. Лексікалогія. Падруч. для студ. філал. фак. ун-таў і пед. ін-таў / М.В. Бірыла, М.Г. Булахаў, П.П. Шуба, АН БССР, Ін-т мовазн. імя Я.Коласа; рэдкал.: К.К. Атраховіч (Крапіва) [і інш.]. – Мінск: Дзярж. вучэб.-пед. выд-ва БССР, 1961. – С. 196–197.
15. Булахов, М.Г. Носович И.И. (1788 – 1877) / М.Г. Булахаў // Булахов, М.Г. Восточнославянские языковеды: Биобиблиографический словарь: В 3-х тт. / М.Г. Булахаў. – Минск: Изд-во БГУ им. В.И. Ленина, 1976. – Т. 1. – С. 173–176.
16. Гарэцкі, М. Развіццё этнаграфіі Беларусі і даследчай працы па беларусазнаўству (70–90 гады і далей) / М.Гарэцкі // Гарэцкі, М. Гісторыя беларускае літаратуры / М.Гарэцкі. – 4-е выд., перапрац. – Мінск: ДВБ, 1926. – С. 145.
17. Гасянкоў, У.Л, Асвета на Мсціслаўшчыне ў XVIII – пачатку XX ст. / У.Л. Гасянкоў // Памяць: Мсціслаўскі р-н: Гіст.-дакум. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / укл. У.Л. Гасянкоў; рэдкал.: У.Л. Гасянкоў [і інш.]. – Мінск: Полымя, 1999. – С. 70–72.
18. Гасянкоў, У.Л. Насовіч Іван Іванавіч / У.Л. Гасянкоў // Памяць: Мсціслаўскі р-н: Гіст.-дакум. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / укл. У.Л. Гасянкоў; рэдкал.: У.Л. Гасянкоў [і інш.]. – Мінск: Полымя, 1999. – С. 80–81.
19. Гілевіч, Н. З клопатам пра песні народа: Кароткі нарыс гісторыі збірання і даследавання беларускіх народных песень / Н.Гілевіч. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1970. – С. 44–46.
20. Гуліцкі, М.Ф. Лексікаграфічная праца І.Насовіча / М.Ф. Гуліцкі // Гуліцкі М.Ф. Нарысы гісторыі беларускай лексікаграфіі (XIX – пач. XX ст.) / М.Ф. Гуліцкі. – Мінск: Выш. шк., 1978. – С. 50–83.
21. Далідовіч, Г. Аўтар слоўніка: [Пра бел. мовазнаўца-лексікографа, фалькларыста і этнографа І.І. Насовіча] / Г.Далідовіч // Краязнаўчая газета. – 2003. – Кастрычнік. (№ 12). – С. 8.

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

22. Далідовіч, Г. Руплівец мовы беларускай: [Пра бел. мовазнаўца-лексікографа, фальклярыста і этнографа І.І. Насовіча] / Г.Далідовіч // Звязда. – 2003. – 8 кастр.
23. Жураўскі, А. Навуковы подзвіг / А.Жураўскі, І.Крамко // ЛіМ. – 1962. – 12 кастр.
24. Жураўскі, А.І. Першы слоўнік старажытнай беларускай мовы / А.І. Жураўскі, І.І. Крамко // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. – 1963. – № 4. – С. 100–110.
25. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старaж. часоў да 1917 г. / М.М. Абраменка [і інш.].; рэдкал.: М.А. Лазарук (адк. сакр.) [і інш.]. – Мінск: Народная асвета, 1985. – С. 332–333.
26. І.І. Насовіч // Географы і геолагі – ураджэнцы Магілёўскай вобласці: Біябібліягр. паказ. / Магіл. абл. б-ка імя У.І. Леніна, Магіл. аддз. Бел. геагр. т-ва, Магіл. дзярж. пед. ін-т; склад.: Л.Я. Гурковіч і інш. – Магілёў, 1995. – С. 26–29.
27. Ігнатоўскі, У. Іван Насовіч / У. Ігнатоўскі // Вольны сцяг. – 1921. – № 2.
28. Казачонак, Е. З гісторыі беларускай філалогіі / Е.Казачонак, Л.Рубцова // Звязда. – 1958. – 24 ліпеня.
29. Камароўскі, Я. Вяха ў гісторыі мовазнаўства. [Да 100-годдзя з дня выхаду ў свет «Слоўніка» І.І. Насовіча] / Я.Камароўскі, І.Шадурскі // ЛіМ. – 1971. – 22 студзеня. – С. 11.
30. Камароўскі, Я. З верай у шчаслівую долю / Я.Камароўскі, М.Прыгодзіч // Чырвоная змена. – 1989. – 19 снежня. – С. 4-5.
31. Камароўскі, Я. І.І. Насовіч і яго слоўнік / Я.Камароўскі // Беларусь. – 1957. – № 7. – С. 28.
32. Карский, Е. Что предстоит сделать по белорусскому языку и литературе? / Е.Карский // Вестник Народного Комиссариата просвещения ССРБ. – 1921. – № 1. – С. 25–28.
33. Карский, Е.Ф. Белорусы. Введение к изучению языка и народной словесности / Е.Ф. Карский. – Вильна, 1904. – С. 126–128, 130, 135, 150, 172, 184, 217, 225, 251–254, 256, 279, 281, 303, 318, 334, 448, 452.
34. Клімаў, С. Каб не парвалася жывая ніць / С.Клімаў // Во славу Родины. – 1992. – 22 сент.
35. Козыре, Л.И. «Словарь белорусского наречия» И.И. Носовича как источник историко-этимологических и этнолингвистических сведений для фразеологии / Л.И. Козыре // Единство восточнославянских народов: прошлое, настоящее, перспективы: Матер. науч. конф. / редкол.: М.Е. Абраменко (отв. ред.) [и др.]. – Гомель, 1995. – С. 101–103.
36. Крывіцкі А.А. Беларускія слоўнікі П.М. Шпілеўскага і І.І. Насовіча / А.А. Крывіцкі // Дыялекталогія беларускай мовы: Дапам. для філал. спецыяльнасцей ВНУ. – Мінск: Выш. шк., 2003. – С. 68–75.

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

37. Лепешаў, І.Я. Класічная праца айчыннай філалогii [«Сборник белорусских пословиц, составленный И.И. Носовием». СПб., 1874] / І.Я. Лепешаў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1974. – № 3. – С. 52–54.
38. Лепешаў, І.Я. Фразеалагізмы ў «Слоўніку беларускай мовы» І.І. Насовіча / І.Я. Лепешаў, Г.Б. Хіхол // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. – 1989. – № 2. – С. 99–105.
39. Лёсік, Я. 1921–1930: Збор твораў / Я.Лёсік; уклад., прадм і камент. А.Жынкіна. – Мінск: Нац. арх. РБ: Выд. Логвінаў, 2003. – С. 33, 182, 245, 274–280, 282, 317, 325, 330, 335, 336, 362, 374.
40. Маляўка, М. Збіральнік скарбаў мовы / М.Маляўка // Вясёлка. – 1988. – № 9. – С. 4-5.
41. Манько, У.У. «Слоўнік беларускай мовы» І.І. Насовіча (1870 г.) у кантэксце станаўлення беларускай лексікаграфіі / У.У. Манько // Сучасныя праблемы беларускай філалогіі і культуры: Матэр. навук.-практ. канф., прысвеч. 10-годдзю фак.-та бел. філалогіі і культуры, Мінск, 16.05.2001 / рэдкал.: А.І. Лугоўскі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДПУ, 2002. – С. 29–31.
42. Марціновіч, А. Лета пасярод восені. Іван Насовіч / А.Марціновіч // У часе прасветленыя твары. Гістарычныя эсэ, нарысы. – Мінск: Полымя, 1999. – С. 219–241.
43. Мініна, В. Збіральнік жывога слова / В.Мініна // Іскра (Чавусы) – 1994. – 29 чэрв.
44. Міхайлаў, П.А. Навуковы подзвіг: [Да 200-годдзя з дня нарадж. І.І. Насовіча] / П.А. Міхайлаў // Беларуская лінгвістыка. – 1988. – Вып. 34. – С. 59–64.
45. Насовіч Іван Іванавіч // Нашы знакамітыя землякі: географы і геолагі – ураджэнцы Магілёўскай вобласці: Біёгр.-бібліягр. даведнік / УА «Магілёўскі дзярж. ун-т імя А.А. Куляшова»; аўт.-склад.: А.Катлёнак [і інш.]; пад аг. рэд. І.М. Шарухі. – Магілёў: МДУ, 2004. – С. 41–43.
46. Насовіч Іван Іванавіч // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Маладзечна і Маладзечанскага р-на / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2002. – С. 123.
47. Насовіч Іван Іванавіч // Пісьменнікі Магілёўшчыны: Бібліягр. паказ. / Магілёўск. абл. аб'ядн. б-ка імя У.І. Леніна, аддз. краязн. літ., давед.-бібліягр. аддз.; склад.: Н.А. Новікава, А.А. Катлёнак. – Магілёў, 1993. – С. 168–169.
48. Носович Иван Иванович // Русский биографический словарь: В 20 т. – Т. 11: Набоков – Певцов. – М.: ТЕРРА–Книжный клуб, 2001. – С. 209.
49. Носович Іван Іванович // Українська радянська енциклопедія. Т. 10: находка–патріархат. – Київ: Головна ред. Української радянської енциклопедії, 1962. – С. 193.
50. Прыгодзіч М. Аўтограф Івана Насовіча / М.Прыгодзіч, А.Прыгодзіч // Роднае слова. – 2006. – № 12. – С. 83.

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

51. Прыгодзіч, М. «Везде характер виденъ твой...» [З гісторыі беларускай лексікаграфіі: Пра І.І. Насовіча] / М. Прыгодзіч // ЛіМ. – 1988. – 5 жніўня (№ 32). – С. 16.
52. Прыгодзіч, М. З аўтографам І.Насовіча: [Да 200-годдзя з дня нараджэння аўтара першага ў белар. лексікаграфіі тлумач. слоўніка] / М.Прыгодзіч // Чырвоная змена. – 1988. – 29 кастр. – С. 8.
53. Прыгодзіч, М. І.І. Насовіч як беларускі лексікограф XIX ст. / М.Прыгодзіч // Беларускае слова на скрыжалях гісторыі: Матэр. навук. чыт., прысв. 100-годдзю з дня нарадж. праф. М.А. Жыдовіч, 19.10.2006, Мінск. – Мінск, 2007. – С. 62–68.
54. Пыпин, А.Н. История русской этнографии: В 4-х кн. / А.Н. Пыпин – СПб.: Тип. М.С. Стасюлевича, 1892. – Т. 4. Белоруссия и Сибирь. – С. 148–153.
55. Ралько, І.Д. Беларускае вершазнаўства / І.Д. Ралько // Вершаскладанне. Даследаванні і матэрыялы / АН БССР, Ін-т літ. імя Я.Купалы. – Мінск: Нав. і тэхн., 1977. – С. 11–12.
56. Савіцкая, І.І. «Слоўнік беларускай мовы» І.І. Насовіча: прабемы мовы і нацыі / І.І. Савіцкая // Слово и словарь = Vocabulum et vocabularium: Сб. науч. труд. по лексикографии / ГрГУ им. Я.Купалы; отв. ред.: Л.В. Рычкова, В.Л. Воронович. – Гродно: ГрГУ, 2007. – С. 84–85.
57. Саламевіч, І.У. Насовіч І.І. / І.У. Саламевіч // Беларускі фальклор: Энцыклапедыя: У 2-х тт. – Т. 2: Лабараторыя традыцыйнага мастацтва – «Яшчур» / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск.: БелЭн, 2006. – С. 239–240.
58. Сенькевіч, В. Іван Насовіч: Выдатны беларускі вучоны, лексікограф, фальклрарыст, этнограф / В.Сенькевіч // Беларускі свет. – 1989. – № 21. – С. 61–66.
59. Сіцько, З. Вяшчун прадвесня / З.Сіцько // Наша слова. – 1993. – 6 кастр.
60. Скварцоў, І. Слова роднае, беларускае: [Пра І.І. Насовіча] / І.Скварцоў // Магілёўская праўда. – 1984. – 11 мая.
61. Срезневский, И.И. Записки о трудах г. Носовича касательно наречия белорусского / И.И. Срезневский // Известия Имп. АН по ОРЯС.– 1852. – Т. 1. – Вып. 2. – С. 74–75.
62. Срезневский, И.И. Разбор «Словаря белорусского наречия» И.И. Носовича (Рукопись) / И.И. Срезневский // Зап. Имп. АН. – 1866. – Т. 8. – Кн. 1. – С. 18–19. Тое ж: Тридцать четвертое и последнее присуждение учрежденных П.Н. Демидо-вым наград 25 июня 1865 г. – СПб., 1866; Асобнае выданне. – СПб.: АН, 1866. – 10 с.
63. Срезневский, И.И. Обозрение замечательнейших из современных словарей (Разбор «Словаря белорусского наречия» И.И. Носовича) / И.И. Срезневский // Известия Имп. АН по ОРЯС. – 1854. – Т. 3.
64. Срезневский, И.И. Разбор сочинения И.Носовича «Алфавитный указатель старинных слов, извлеченных из «Актов, относящихся к истории Западной России», изданных в 1853 году» / И.И. Срезневский // Отчет о восьмом

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

присуждении наград графа Уварова 25 сентября 1865 года. – СПб.: Тип. Имп. АН, 1866. – С. 14-16. Тое ж: Зап. Имп. АН. – Т. 8. – Кн. 1. – 1865. С. 4-6; Русский инвалид. – 1865. – № 212; Асобнае выданне. – СПб.: Тип. Имп. АН, 1866. – 3 с.
65. Станкевіч, Ян. І.Насовіч пра назоў «Крывічы» / Я.Станкевіч // За родную мову й праўдзівы назоў. Выбранае / Я.Станкевіч. – Вільня: Інстытут беларусісітыкі, 2006. – С. 336.
66. Столетие первого белорусского словаря // Сельская газета. – 1971. – 14 янв.
67. Судник, М.Р. Носович и современность / М.Р. Судник // Новости ЮНЕСКО. Информационный бюллетень. – Париж, 1977. – № 11. – С. 20–23.
68. Суднік, М. Вучоны, даследчык [пра І.І. Насовіча] / М. Суднік // Маяк Прыдняпроўя (Быхаў). – 1980. – 5 чэрв.
69. Суднік, М.Р. І.І. Насовіч і яго слоўнік / М.Р. Суднік // Насовіч І.І. Слоўнік беларускай мовы. – Мінск: БелСЭ, 1983. – С. 3–6.
70. Суднік, М.Р. Іван Іванавіч Насовіч – выдатны вучоны і асветнік: (Да 200-годдзя з дня нараджэння) / М.Р. Суднік // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. – 1989. – № 2. – С. 92–99.
71. Суднік, М.Р. Насовіч Іван Іванавіч / М.Р. Суднік // Беларуская мова. Энцыклапедыя / Пад рэд. праф. А.Я. Міхневіча; Рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1994. – С. 379–382.
72. Суднік, М.Р. Насовіч Іван Іванавіч / М.Р. Суднік // БелСЭ / Гал. рэд. П.У. Броўка. – Т. 7. Манцякі – Паддубічы. – Мінск: БелСЭ, 1973. – С. 437.
73. Суднік, М.Р. Насовіч Іван Іванавіч [1788–1877] / М.Р. Суднік // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. / Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1987. – Т. 4: Накцюрн–Скальскі. – С. 44–45.
74. Суднік, М. Слоўнік Насовіча / М.Суднік // Беларусь. – 1950. – № 9. – С. 10.
75. Суднік, М. І.І. Насовіч [Аўтар «Словаря белорусского наречия», этнограф. Яго жыццё і дзейнасць. Нарыс] / М.Р. Суднік // Беларусь. – 1946. – № 7. – С. 24–27.
76. Суднік, М.Р. Неапублікаваны рукапіс / М.Р. Суднік // Беларусь. – 1949. – № 5. – С. 31–32.
77. Томашевич, З.М. И.И. Носович как белорусский паремиолог / З.М. Томашевич // Региональные особенности восточнославянских языков, литератур, фольклора и методы их изучения: Тез. докл. III респ. конф. / Редкол.: В.В. Аниченко (отв. ред.) [и др.]: В 2-х ч. – Гомель, 1985. – Ч. 1. – С. 202 – 203.
78. Хаўратовіч, І.П. Насовіч Іван Іванавіч / І.П. Хаўратовіч // Беларуская энцыкла-педыя: у 18 т. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Т. 11. – Мінск.: БелЭн, 2000. – С. 200.
79. Хаўратовіч, І. П. Насовіч Іван Іванавіч / І. П. Хаўратовіч // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Оршы і Аршанскага р-на: У 2 кн. – Кн. 1. / Рэд. кал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1999. – С. 143–144.

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

80. Хаўратовіч, І.П. Насовіч Іван Іванавіч [1788–1877] / І.П. Хаўратовіч // Мысліцелі і асветнікі Беларусі: X–XIX ст.: Энцыкл. даведнік. / Склад. Г.А. Маслыка. – Мінск: БелЭн., 1995. – С. 511–513.
81. Хілюк, А. Аўтограф Носовіча / А.Хілюк // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). – 1989. – 19 студз.
82. Хіневіч, Т. Семантычная структура слова ў СБМ І.І. Насовіча / Т.Хіневіч // IV навуковыя чытанні, прысвечаныя Сцяпану Некрашэвічу: Матэр. навук. канф. / Навук. рэд.: А.А. Станкевіч, І.Ф. Штэйнер. – Гомель: ГДУ, 1999. – С. 118–121.
83. Хіхол, Г.Б. Апісанне дзеясловаў са значэннем пачатку дзеяння ў «Слоўніку беларускай мовы» І.І. Насовіча / Г.Б. Хіхол // Словообразование и номинативная деривация в славянских языках: Тез. докл. III респ. конф., Гродно, 5-6.10.1989: В 2 ч. / Ин-т языкозн. им. Я.Коласа АН БССР, Гомельский гос. ун-т им. Ф.Скорины; Отв. ред. В.М. Никитевич. – Гродно, 1989. – Ч. 2. – С. 100–101.
84. Хіхол, Г.Б. Адлюстраванне дэрывацыйных сувязей паміж словамі ў «Слоўніку беларускай мовы» І.І. Насовіча / Г.Б. Хіхол // Словообразование и номинативная деривация в славянских языках: Тез. докл. II респ. конф., Гродно, 25-26.09.1986: В 2 ч. / Ин-т языкозн. им. Я.Коласа АН БССР, Гродненский гос. ун-т им. Я.Купалы; Отв. ред. В.М. Никитевич. – Гродно, 1986. – Ч. 2. – С. 109–111.
85. Цішчанка, І. Волат нацыянальнай культуры / І.Цішчанка // Мастацтва Беларусі. – 1988. – № 12. – С. 56–59.
86. Цішчанка, І.К. Фальклярыстычная спадчына І.І. Насовіча / І.К. Цішчанка // Цішанка І.К. Да народных вытокаў: Збіранне і вывучэнне бел. фальклору ў 50-60-я гг. XIX ст. / Рэд. А.С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1986. – С. 211–245.
87. Цішчанка, І. Першапраходзец / І.Цішчанка // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). – 1984. – 1 студз.
88. Цішчанка, І. Першапраходзец: [Пра беларускага фальклярыста і лексіколага І.І. Насовіча] / І.Цішчанка // Полымя. – 1983. – № 10. – С. 149–163.
89. Цішчанка, І. Хто аўтар ананімнай паэмы / І.Цішчанка // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1984. – № 3. Тое ж: Маяк Прыдняпроўя (Быхаў). – 1984. – 1 лістап.
90. Цішчанка, І.К. І.І. Насовіч / І.К. Цішчанка // Беларуская фальклярыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гг. XIX – пач. XX ст. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – С. 37–47.
91. Шакун, Л.М. Творчая спадчына І.І. Насовіча ў асвятленні лінгвістычнай навукі / Л.М. Шакун // Беларуская мова. – 1990. – Вып. 18. – С. 18–29. Тое ж: // Шакун Л.М. Карані роднай мовы: Выбраныя працы па гісторыі беларускай мовы / Л.М. Шакун. – Мінск, 2001. – С. 185–193.

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

92. Шапиро, М.М. Словарь Носовича. Библиографическая заметка / М.М. Шапиро // Филологические записки.– 1873. – Вып. 1. – С. 1–20.
93. Шаруха, І.М. Зорка айчыннай этнаграфіі: Да 150-годдзя Рускага геаграфічнага таварыства / І.М. Шаруха // Магілёўская даўніна. – 1996. – № 4. – С. 41–44.
94. Шейн, П.В. Иван Иванович Носович. Краткий биографический очерк / П.В. Шейн // Известия Имп. АН по ОРЯС. – Т. 5. – Кн. 3. – 1900. – С. 956–968. Тое ж: Асобнае выданне. – Спб., 1900. – 13 с.
95. Шчэрбін, В.К. «Слоўнік беларускай мовы» І.І. Насовіча / В.К. Шчэрбін // Беларуская мова. Энцыклапедыя / Пад рэд. праф. А.Я. Міхневіча; Рэдкал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1994. – С. 524–525.
96. Юргелевіч, П.Я. Нарыс сучаснай беларускай мовы з гістарычнымі каментарыямі: фанетыка, арфаэпія, графіка і правапіс, лексіка і фразеалогія. Дапам. для студ. філал. і гіст.-філал. фак. пед. ін-таў / П.Я. Юргелевіч. – Мінск: Вучпедвыд БССР, 1958. – С. 146–147.
97. Юрчанка, Г. Памяці І.І. Насовіча / Г.Юрчанка // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). – 1988. – 22 лістап.
98. Яновіч, М. Іван Насовіч [Пра бел. мовазнаўца-лексікографа, фальклnetwork фальклярыста і этнографа] / М.Яновіч // Народная воля. – 2002. – 30 мая.
99. Ярохін, А. Яго сцяжынкі праляглі праз Краснапольшчыну / А.Ярохін // Чырвоны сцяг (Краснаполле). – 1988. – 18 кастр.
100. Яскевіч, А. Невядомае пра Івана Насовіча: [Да 200-годдзя з дня нараджэння беларускага філолага]/ А.Яскевіч // Голас Радзімы. – 1989. – 16 сакавіка (№ 11). – С. 7.
101. Яскевіч, А. Новае пра Насовіча / А.Яскевіч // Яскевіч,А. Словам скароны свет / А.Яскевіч; АН Беларусі, Ін-т літ-ры імя Я.Купалы. – Мінск, 1995. – С. 92–95.
102. Яцкевіч, З. Іван Насовіч / З.Яцкевіч // Вестник Могилева. – 1993. – 15 апреля. – С. 6.
103. Яцкевіч, З.Л. Насовіч Іван Іванавіч / З.Л. Яцкевіч // Архівісты Беларусі: біябібліягр. даведнік / Камітэт па архівах і справаводству пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь, Беларускі НДІ дакументазнаўства і архіўнай справы; Складальнікі: С.У. Жумар, М.Ф. Шумейка. – Мінск: БелНДІДАС, 2006. – С. 30–31.
104. Яшкін, І.Я. Іван Іванавіч Насовіч і беларуская дыялекталогія / І.Я. Яшкін // Весці АН БССР. Серыя грамадскіх навук. – 1989. – № 3. – С. 94–102.
105. Яшкін, І.Я. Слаўны дзеяч беларускай культуры / І.Я. Яшкін // Беларуская мова і літаратура ў школе. – 1988. – № 10. – С. 74–75.
106. Nosowicz Jan syn Jana // Wielka encyklopedya powszechna ilustrowana. Serya II. – T. III. – Warszawa: Drukarnia Gazety Handlowej, 1904. – S. 245.

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)